Аўторак, 02 Красавік 2019

Віцяблян Яраслава і Ўладзімера Кійко будуць судзіць за сьвяткаваньне Дня Волі

Друкаваць (/news/administracyiny-perasled/item/3147-sudzits-za-svyatkavanne-dnya-voli?tmpl=component&print=1) | Эл. пошта (/component/mailto/?tmpl=component&template=lt_news&link=273a3efc0c21a3bdd4026156605cc8085202bbfa)

Ацаніць гэты матэрыял (23 галасоў)



(/media/k2/items/cache/9fa010461d33e025bca8f044617e5331_XL.jpg)

Браты Кійко каля Альгерда на БНР-101

Праз тыдзень пасьля сьвяткаваньня Дня Волі ў Віцебску (/news/mirnyja-skhody/item/3137-dzen-voli) на братоў Уладзімера і Яраслава Кійко міліцыянты склалі пратаколы аб адміністрацыйным правапарушэньні паводле ч.1 арт. 23.34 КаАП – “за пікет з выкарыстаньнем палотнішча бел-чырвона-белага колеру”.

Як расказаў “Віцебскай вясьне” старэйшы брат Яраслаў да яго дамоў прыйшоў міліцыянт, які назваўся ўчастковым, і прад’явіў пратакол.

“Знаходзячыся каля помніку “Князю Альгерду”… у парушэньні закону “Аб масавых мерапрыемствах” ажыццявіў пікетаваньне з выкарыстаньнем палотнішча бел-чырвона-белага колеру”, – гаворыцца ў пратаколе, складзеным міліцыянтам Кастрычніцкага РАУС Віцебску **Канстанцінам Ярашэўскім**.

> “Гэты ж самы міліцыянт, што прыходзіў да мяне, заходзіў і да майго брата, але дома не застаў. Там таксама казаў, што ён ягоны ўчастковы, хоць мы з братам жывем на розных вуліцах і ўчастковыя ў нас розныя. А празь дзень гэты “участковы” чакаў майго брата на выхадзе з тэатру. За паўгадзіны да гэтага я размаўляў з братам па тэлефоне, і той сказаў, што знаходзіцца ў тэатры. Таму я раблю выснову, што нашыя тэлефонныя размовы з братам праслухоўваюцца”, – расказаў Яраслаў Кійко.

“Улада лёгка падмінае пад сябе і мараль, і закон, калі на кану стаіць пытаньне кантролю за людзьмі, якія хочуць адчуваць сябе ў сваёй жа дзяржаве паўнавартаснымі грамадзянамі. Нават калі ты вырашыў у нядзельны сьвяточны дзень сфатаграфавацца з традыцыйным і нікім не забароненым сьцягам гэтай краіны, ты ўжо трапляеш у разрад “нязгодных”, на жаль…" – дадае Яраслаў.

> Актывісты з пратаколамі не пагадзіліся і даваць тлумачэньні адмовіліся.

Суд над віцяблянамі адбудзецца 11 красавіка ў 10.00 у будынку суду Кастрычніцкага раёну Віцебску.

Нагадаем, напярэдадні Дня Волі 24 сакавіка віцябляне ўшанавалі БНР-101 ускладаньнем кветак (/news/mirnyja-skhody/item/3137-dzen-voli) да помнікаў князю Альгерду і Уладзімеру Караткевічу, а таксама да памятнай дошкі Васілю Быкава і да мэмарыялу, усталяванаму каля Усьпенскага сабору на месцы пахаваньня нявінна забітых грамадзянаў. Усё, што адбывалася падчас ускладаньня кветак, фіксавалі на фота- і відэакамэры супрацоўнікі міліцыі ў цывільным адзеньні. Але ў той дзень нікога не затрымлівалі і не папярэджвалі.

Уладзімер Бяляўскі

Апублікавана ў Адміністрацыйны перасьлед (/news/administracyiny-perasled) , Мірныя сходы (/news/mirnyja-skhody)
Тэгі: Яраслаў Кійко (/itemlist/tag/Яраслаў%20Кійко) Уладзімер Кійко (/itemlist/tag/Уладзімер%20Кійко) Дзень Волі (/itemlist/tag/Дзень%20Волі) БНР (/itemlist/tag/БНР) артыкул 23 34 КаАП (/itemlist/tag/артыкул%2023%2034%20КаАП) пікет (/itemlist/tag/пікет)

Яшчэ ў гэтым разьдзеле: « Журналістаў Зьмітра Лупача і Тацяну Смоткіну выклікалі ў міліцыю (/news/administracyiny-perasled/item/3143-vyklikali-u-militsyyu) Яшчэ адзін пратакол за БНР-101 у Віцебску. У міліцыю выклікалі Міколу Качурца - абноўлена » (/news/administracyiny-perasled/item/3148-mikola-kachurtsa)

Вярнуцца ў пачатак (/news/administracyiny-perasled/item/3147-sudzits-za-svyatkavanne-dnya-voli#startOfPageId3147)

© 2011 - 2023 Віцебская вясна (/). Пры выкарыстаньні матэрыялаў абавязковая гіпэрспасылка. Email: vitebskspring@proton.me (mailto:vitebskspring@proton.me)

(Https(/